УДК 378.01:811.161.3

# КУЛЬТУРА ВУСНАГА І ПІСЬМОВАГА МАЎЛЕННЯ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ ТЭХНІЧНАГА ПРОФІЛЮ

**Смалянка Г.А., Занкавіч А.П.,** к.філал.н., дацэнт
БДАГУ, г. Мінск, Республика Беларусь

Канцэпцыя сучаснай гуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў заснавана на сусветнай гуманістычнай тэндэнцыі захавання і развіцця нацыянальна–культурнай самабытнасці народаў, важнейшым элементам якой з'яўляецца нацыянальная мова. Сярод асноўных сусветных кампетэнцый вылучаецца і моўная кампетэнцыя сучаснай моладзі. Моўная падрыхтоўка студэнтаў у вышэйшых навучальных установах тэхнічнага профілю ўяўляецца як стройная сістэма, структурныя кампаненты якой пастаянна ўдасканальваюцца ў залежнасці ад прафесійнай накіраванасці будучых спецыялістаў. Запатрабаванымі напрамкамі выкарыстання звязнага маўлення ў прафесійнай дзейнасці з'яўляцца наступныя:

– устанаўленне сацыяльных кантактаў;

– перадача і атрыманне інфармацыі;

– уздзеянне на аўдыторыю (субяседніка);

– афармленне дакументаванай інфармацыі;

– вырашэнне маральна–этычных зносін і інш.

Маўленне чалавека – гэта праяўленне асобы, першачарговы паказчык яе інтэлектуальнага ўзроўню. Спецыяліст тэхнічнай сферы павінен умець валодаць дакладнай прафесійнай мовай, выпрацоўваць рашэнні, заключаць дагаворы, прымаць абавязацельствы, праводзіць тэндары, афармляць дакументы. Сучаснае выкарыстанне гутарковага, навуковага, афіцыйна–справавога стыляў ва ўмовах білінгвізму вядзе да парушэння цэнтральных нормаў правільнасці маўлення. У працэсе навучання неабходна даваць не толькі веды пра мову, а і вучыць валодаць мовай, у тым ліку і культурай маўлення. Моўная падрыхтоўка студэнтаў прызвана актуалізаваць наступныя комплексныя мэты:

– фарміраванне тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў па выкарыстанню камунікатыўных якасцей маўлення ў розных стылях мовы;

– фарміраванне культуры маналагічнага і дыялагічнага маўлення ў службовых зносінах.

Студэнт павінен валодаць уменнямі:

– выкарыстоўваць камунікатыўныя якасці маўлення ў розных стылях;

– прымяняць варыянтныя моўныя сродкі ў вусным і пісьмовым маўленні;

– будаваць маналагічнае выказванне;

– весці дыялагічнае маўленне;

Студэнт павінен ведаць:

– на рэпрадуктыўным узроўні – характарыстыку асноўных камунікатыўных якасцей маўлення, іх значэнне ў розных функцыянальных стылях мовы;

– на прадуктыўным узроўні – ведаць асаблівасці маўленчага службовага этыкету;

– на творчым узроўні – ажыццяўляць правільнае, дакладнае, лагічнае, чыстае, дарэчнае, разнастайнае і выразнае маўленне ў розных стылях мовы.

Моўная падрыхтоўка – гэта працэс атрымання практычных уменняў і навыкаў, які абапіраецца на індывідуальны творчы патэнцыял і асабістую ініцыятыву. Культура маўлення маладога спецыяліста адлюстроўвае ўменне правільна і пераканаўча выказвацца, дакладна і чыста мысліць, адэкватна ўжываць моўныя сродкі ў прафесійных і жыццёвых сітуацыях. Такім чынам, маўленчая культура з'яўляецца адным з цэнтральных напрамкаў навучання мове, які аб'яднаны ў аднайменны асобны модуль. Дадзены модуль «Культура прафесійных зносін» з'яўляецца састаўной часткай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» і ўключае наступныя элементы:

– камунікатыўныя якасці маўлення;

– маўленчы службовы этыкет;

– прамыя і ўскосныя зносіны;

– дзелавыя і свецкія зносіны;

– формы арганізацыі маўлення і інш.

Удасканаленне моўнай падрыхтоўкі выносіць на першы план пытанні арганізацыі самастойнай работы (кіруемай самастойнай работы), асноўная мэта якой – пашырыць і паглыбіць веды, уменні і здольнасці навучаемых.

Аналіз выкарыстання інтэрнацыянальнай тэрміналогіі ў тэхнічнай літаратуры займае асаблівае месца ў прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў. Параўнальны лексічны аналіз тэкстаў розных стыляў і падстыляў паказвае на пераважную колькасць тых ці іншых адзінак. Напрыклад, дастаткова прывесці параўнанне навукова–папулярнага і навукова–тэхнічнага ўрыўкаў.

Задачы дысцыпліны ўключаюць не толькі імкненне навучыць будучых камунікантаў нормам маўлення (беларускага ці рускага) у розных сферах зносін: вучэбна–прафесійнай, афіцыйна–справавой, сацыяльна–культурнай, але і пазнаёміць з асаблівасцямі ўжывання навуковай тэрміналогіі на пэўнай мове. Пошук і падбор адпаведнай адзінкі павінен садзейнічаць фарміраванню мыслення і светаўспрымання, накіраваных на авалоданне і мовай, і культурай маўлення.

Культура маўленчых зносін нашых студэнтаў закранае не толькі сферу навукова–тэхнічную, але і афіцыйна–справавую, так як работа з дакументамі–гэта важны элемент прафесійнай дзейнасці. Афармленне афіцыйна–распарадчай дакументацыі патрабуе кампетэнцыі не толькі ў сферы справаводства, але і мовы. Напрыклад, выкарыстанне аддзеяслоўных назоўнікаў меснага склону ў тэкстах загадаў, распараджэнняў і ўказанняў: *аб падрыхтоўцы..., аб правядзенні..., аб увядзенні ў дзеянне і* г.д. Асаблівую складанасць уяўляе ў дакументаваных тэкстах правапіс уласных імёнаў і прозвішчаў на беларускай і рускай мовах, напісанню якіх удзяляецца недастаткова ўвагі ў сучасных даведніках.

Перавага сучасных пісьмовых формаў кантролю ведаў непазбежна вядзе да лексічнага збяднення мовы моладзі, што адзначаецца выкладчыкамі сацыяльна–гуманітарных дысцыплін.

Вялікая ўвага пры вывучэнні мовы ў нефілалагічных УВА павінна надавацца фарміраванню камунікатыўнай кампетэнцыі спецыялістаў у сферы прафесійных і службовых зносін, выпрацоўцы навыкаў правядзення дзелавых гутарак і перамоў, уменню лагічна і абгрунтавана выступаць публічна, прытрымліваючыся маўленчага этыкету.

УДК 796.012

# ИСПОЛЬЗОВАНИЕ СОВРЕМЕННЫХ КОМПЬЮТЕРНЫХ И ИНФОРМАЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ В СИСТЕМЕ ФИЗИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ СТУДЕНТОВ ТЕХНИЧЕСКОГО ВУЗА

**Сонина Н.В.,** к.п.н., доцент, **Смольский С.М.,** к.б.н.
БГАТУ, г. Минск, Республика Беларусь

Инновации в системе физического воспитания становятся естественным явлением. По мере накопления знаний в области физической культуры, обретения научно-педагогического опыта, появления нового спортивного инвентаря и оборудования, улучшения проектирования спортивных объектов появляются новые идеи преобразования учебного процесса, обеспечения больших гарантий укрепления здоровья студентов, улучшения их физической подготовленности.

Для свободной ориентации в информационных потоках современный специалист должен уметь получать, обрабатывать и использовать информацию с помощью компьютеров,телеком-муникационных средств информационных технологий [2].

Вопросы овладения современными коммуника-ционными технологиями и инновациями и их использование становится одним из основных компонентов профессиональной подготовки специалистов АПК.

Это требует разработки и внедрения в учебный процесс кафедр физического воспитания профессионально-ориентированных программных средств, направленных на овладение необходимыми знаниями и их использования в профессио-нальной и спортивной деятельности.